Тамара Барадзёнак

# Роднай вёсачкі цяпло



Тамара Барадзёнак

# Роднай вёсачкі цяпло





Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак нарадзілася 4 мая 1959 года ў вёсцы Казіно Селішчанскага с/с Ушацкага раёна. На творчым рахунку Тамары Дзмітрыеўны 25 выдадзеных зборнікаў, шматлікія публікацыі ў абласных і рэспубліканскіх газетах і часопісах.

Падборкі яе вершаў уваходзяць у калектыўныя зборнікі беларускіх паэтаў. Вынік яе творчага плёну – уступленне ў 2005 годзе ў Саюз пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь.



*Тамара Дзмітрыеўна з сынам Дзмітрыем на тым месцы,*
*дзе стаяла яе родная хата ў вёсцы Казіно*

*жнівень 2004г.*


д. Казино
р. Ушача
оз. Умильно
Солонец 1
Салонец 1
Центральная ул.
Озёрная ул.

***

Выйду раніцай з хаты,
Кіну вокам наўкола:
Корміць шпак птушанятак,
Малышоў сваіх кволых.

Сонца парастак песціць,
Маці з дзіцем гуляе –
Без любові на свеце
Нішто не ўзрастае.

# ПАМЯЦІ ЗНЕСЕНАЙ ВЁСКІ

Вецярок над лазіной
Гойдаў павуцінку.
Знаў я стрэлася з табой,
Рэчанька Казінка.

Не была тут год мо з дзесяць,
Ледзь змагла пазнаці.
Стала рэчанька вузець,
Стала высыхаці.

Там, дзе вёсачка была,
Ужо няма і знаку,
Яблынька мая расла –
Ссеклі небараку.

Вёску быў загад знасіць,
Людзі былі супраць
Колькі ездзілі прасіць,
Іх не сталі слухаць.

Перспектывы, бач, няма
У маленькай вёскі
Так не стала Казіна,
Толькі дзве бярозкі.

Пуста, глуха зараз тут,
Так за вёску крыўдна!
Штосьці правады гудуць
На слупах надрыўна.

Як прыемна тут стаяць,
Слухаць песні ветру!
Нешта роднае чуваць
Нават у паветры.

Мне не боязна зусім
Хоць тут і адна я,
Я ж зраднілася з усім,
Як была малая.

З полем, лесам і ракой,
З возером Умілнам,
Хай жа вёсачцы маёй
Будзе верш мой гімнам.



# ВЁСАЧКА МАЯ

Вёсачка мая – прасцячка-працаўніца,
Ты заўсёды мужнаю была.
Не здавацца, у горы не схіліцца,
Уласцівасць у табе жыла.

У памяці змагла ты захаваці
Ліхалецце тых, былых гадоў.
На вайну праводзіла, як маці,
З ворагам на бой сваіх сыноў.

Іх з вайны вярнулася нямнога,
Ды і тыя змучаны ў баях,
Адпачыць ім не прыйшлося доўга –
Праца іх чакала на палях.

Не было ў цябе гультаяватых,
Людзі твае рупныя ўсе,
Ураджай заўсёды ў іх багаты,
Праца хлеб і шчасце ім нясе.

Хто працуе, у таго жыта родзіць –
Так казалі некалі дзяды –
Хто старанны, хлеба той не просіць,
Працаўнік не будзе знаць бяды!...



## ПРЫВАРОЖАНА

Гімнам ранню ліецца
У небе спеў жаўрука.
Звонка б’юць аб вядзерца
Струмяні малака.

Прачынаюцца хаты,
Пачынаецца дзень.
У тумане калматым
Статак дружна ідзе.

Ад майстэрань калгасных
З самай ранняй зары
Ад’язджаюць на працу
У палі трактары.

Як на маміным ганку
Люба ранкам стаяць!
Пах вясковых сняданкаў
З асалодай ўдыхаць.

Успамін, сэрцу мілы,
Часта сніцца мне ў сне.
Моцна ж прываражыла
Мая вёска мяне!

# ТАТУ І МАМЕ

Два ясені лісцем шумяць
Прыветна ля роднае хаты.
На ганак мяне сустракаць
Выходзяць матуля і тата.

Маршчынак паменела ўраз,
З вачэй прападае трывога.
Няма даражэй мне за вас
На гэтай зямельцы нікога.

Трывога і страх за мяне
Зноў прыйдуць, як знікну за брамай,
Я вас пачала разумець
Тады, як сама стала мамай.



## НА ЛУЗЕ

Туман яшчэ над полем рассцілаўся,
Мо, ноч яго забылася забраць.
Да сонца бацька луг касіць сабраўся,
Я з ім іду пракосы разбіваць.

Луг заліўны, што ля лясной рачулкі,
Ажно звініць ад птушай гаманы.
Старое дрэва дзяцел доўбіць гулка –
Разбілі елку летась перуны.

І вось каса зашорхала ўжо ціха,
Запахла свежаскошаной травой.
Каля куста спалохалі зайчыху,
Што тая ледзь не ў граблі галавой.

Сынок учора з намі ў луг прасіўся,
Шкада не ўзялі – вось бы паглядзеў!...
А бацька ўжо да рэчкі дакасіўся,
Касу ўжо абмывае ў вадзе.

Ды раптам знак мне робіць, каб маўчала,
Паказвае кудысьці над вадой
Аказваецца, качка праплывала,
А следам – цэлы вывадак за ёй.

Туман забрала ночка – не забылася,
Раса ад першых промняў зіхаціць.
Я на пытанне маці, ці стамілася,
Скажу, што мне ўдалося адпачыць.

# АД ХВАЛЬ АЛЬЗЯНІЦЫ

Як жа рэчка абмялела!
Нібы ручаінка, стала.
Колісь радасна і смела
Нас малых яна купала.

Час дзяцінства, час цудоўны –
Незабыўны, незваротны…
На шырокай рэчцы чоўны,
Гнёзды качак у чаротах.

Хваль празрыстых ціхі плёскат
І вянок з лілеяў белых…
Чарада тых дзён дзівосных,
Як ты хутка праляцела!..

Са слязінкаю міжволі
Прыгадаю час далёкі…
Не, не высахнуць ніколі
Маёй памяці вытокі!..



# КРЫНІЦА

Соладка запахла медуніца
У спякотна-жніўную пару.
Зноў я да цябе прыйшла, крыніца,
Як з сяброўкай шчырай, гавару.

Да цябе прыходзіла я часта
Змалку і ў юнацкія гады,
Каб зачэрпнуць коўшыкам драпчастым
Чыстай і стюдзёнае вады.

І ў хвіліны горычы, і ў шчасці
Да цябе так хочацца прыйсці,
Сесці, на далонь шчаку пакласці,
Пасядзець, падумаць аб жыцці.

Боль, трывогу, неспакой душэўны
Мне вада вылечвае твая.
Колькі жыць, к табе хадзіць мне, пэўна,
Чыстая крынічанька мая.

Тут усё, што мне душу вярэдзіць
Упадзе ў ваду, як з дрэў лісток,
Зноў прыйшла я, каб цябе праведаць,
Светлая крынічка – мой выток.



**Памяці майго дзядулі Аўласенка Івана Андрэевіча
і ўсіх тых, хто аддаў жыццё за свабоду і незалежнасць
нашай Радзімы**

Па фотаздымку ведаю цябе
Зусім ужо ад часу пацямнелым.
Загінуў за Айчыну ў барацьбе
Ты, мой дзядуля, партызанам смелым.

Было табе на той час трыццаць пяць,
Сіротамі сыночкі засталіся,
І іх адной бабулі гадаваць
Прыйшлося са слязьмі, што ўсё ліліся.

Пайшла з жыцця салдацкаю ўдавой –
Не здрадзіла адзінаму каханню.
На небе, пэўна, стрэлася з табой
Галубкай белай, жонкаю адданай.

Быў кавалём ты добрым, шмат што ўмеў
І чалавекам быў сумленным, чулым.
У кузні молат больш не зазвінеў,
Нават тады, калі вайна мінула.

Не даў табе лёс гушкаць на руках
Сваю ўнучку, ёй раскрыць абдымкі,
Ды ўсё ж бывае, што мне сніцца ў снах
Дзядуля малады мой з фотаздымка.

Так выйшла – за бязлітаснай вайной
Не зведала цяпла тваёй ладоні,
І горыч, што не стрэлася з табой,
У сэрцы не сціхае нават сёння.

Жыве той боль варожае чаргі,
Што ў час ліхі прабіла твае грудзі…
Пад мірным небам песні і сцягі
Лунаюць хай, а войнаў больш не будзе.

***

Сціплая добрая бабка Прасення
Часта прыходзіць мне ў сны па начах:
Сумныя вочы з блакітным адценнем
І, як заўсёды, слёзы у вачах.

Нярэдка ў дзяцінстве пытала я ў маці,
Чаму часта плача бабулечка ў нас.
– А як жа не плакаць? Траіх пахаваці –
Сыноў двух, дачушку, – гучала ў адказ.

І пачынаўся аповед той сумны –
Балючае рэха далёкай вайны,
Як двое сыночкаў – прыгожых, разумных
Забраў час ліхі без усякай віны.

Згас позірк абодвух сыноў прамяністы,
Лёс ім – маладзенькім – ляжаць у зямлі.
Найпершыя ў вёсцы былі гарманісты,
Уцеха і радасць для маці былі.

Старэйшы Змітрок у блакаду загінуў,
Фашыст у акопе яго расстраляў.
Малодшы Цімошка матулю пакінуў –
Кароў пад прымусам на станцыю гнаў.

І аніякай вестачкі болей
Ад сына – падлетка дамоў не прыйшло.
І рвалася сэрца матулі ад болю,
Гарэла ў ім гора, смылела, пякло.

Ад хаты не сходзіла гэтае гора,
Прымусіла кубак свой выпіць да дна –
Трохгодка Любаша хварэла адзёрам,
Згарэла, як свечка, за тыдзень яна.

Як беднае сэрца ў знямозе стагнала!
Як жыць, як трываць і як не звар'яцець?
З шасці траіх дзетак вайна адабрала,
А жыць было трэба, астатніх глядзець.

Горкія слёзы, нялёгкая праца
І ўсё ліхалецце тых цяжкіх гадоў –
Балець стала сэрца, стаў зрок пагаршацца,
А слёзы па дзецях ліла зноў і зноў.

І да зыходу ні на імгненне
Гора сваё не забыла яна.
Помню я вочы бабулі Прасенні…
Хай жа не губіць больш лёсы вайна!



*Прысвячаецца памяці маёй бабулі*
*Рудзёнак Еўфрасінні Цімафееўны –*
*ўраджэнкі в. Матырына Ушацкага раёна*



## РОДНАЯ ХАТА

Ля бацькоўскай хаты зноў стаю я,
Захад яркім полымем гарыць.
Як сяброўку, яблыню старую
Гладжу па шурпатае кары.

Штосці сёння не дае спакою,
Разганяе думак чараду –
Здарыцца ж калі-небудзь такое,
Што сюды я болей не прыйду.

Яшчэ больш асірацее хата –
Не чакаць ёй лепшае пары.
Засумуе, нібы вінавата,
Што сышлі яе гаспадары.

Не, да роднай хаты я вярнуся,
Не пакіну я яе адну –
З хмаркі кропляй дажджавой пральюся,
Промнем сонца ў вокны зазірну.

Калыхнецца ціхенька паветра
Пад нябёс адвечнай сінявой,
Я шапну праз цёплы подых ветру:
– Не сумуй, хацінка – я з табой… –





## БАЦЬКАЎ КАЛОДЗЕЖ

Пакуль жыву з дазволу Божага,
Спяшаю ў вёску зазірнуць,
Каб тут з бацькоўскага калодзежа
Вядро вадзіцы зачарпнуць.

Калодзеж гэты – маю спадчыну –
Капаў мой бацька малады.
Зноў нібы чую просьбу матчыну:
– Дачушка, прынясі вады! –

Ішла да зруба заінелага,
Таптала снегу дываны.
Пакусваў пальцы счырванелыя
Вядзерны вочап ледзяны.

Зіма ўжо крочыць не зазімкамі –
Не за гарамі ж Каляда.
Ліецца мне ў вядро з ільдзінкамі
Такая чыстая вада.

Усе нягоды ёй змываюцца,
Сплыве журба да забыцця.
З глытком гаючым зноў вяртаюцца
Надзея, прага да жыцця.

Напоі-слодычы заморскія
Па мне – дык саступаюць ёй.
Вада з калодзежа бацькоўскага –
Няма смачней яе – сваёй.

# МОЙ САМЫ СВЕТЛЫ УСПАМІН
(паэма)

На зломе дзён сваіх сягоння,
Калі цяжар гняце душу,
Калі баліць яна і стогне,
Я не здаюся – я пішу.

А што пішу? Што сэрца грэе –
Пра дзён маленства ўспамін.
Слязінкай позірк пацяплее
Як прыгадаю дзень адін…

…Сярод лясоў стаяла вёска –
Пяць невялікіх сціплых хат.
Старыя клёны і бярозкі
Тут шапацелі ціха ў лад.

Жылі тут дружна між сабою
Суседзі з вёсачкі маёй.
Рабілі справы грамадою,
Гулялі разам – сябрыной.

Спяваць умелі, весяліцца
І трапны жарцік падпускаць.
Было чаму тут павучыцца,
Каб у жыццё з сабою ўзяць.

Васіль – дзед з пышнай барадою
Гісторый розных процьму знаў.
Каб быў пісьменны – дык такое
Ён бы нашчадкам напісаў!

А дзед Паўлюк! Душа – дзядуля,
Наіўны, добры чалавек.
Ні слова кепскага не чулі,
Пражыў з лагодай ён свой век.

Гануля – бабка, бабка Каця
І бабка Мар'я там жылі.
На агародах і ў хаце
Заўсёды ў клопатах былі.

А дзед Касцюк – хаця пануры,
Але ж суседям пасабляў.
Нягледзячы на позірк хмуры,
Мяне – малую – заўважаў.

Даваў заўжды мне яблык, грушу,
Ці жменю спелых сініх сліў.
Суседзі, любыя, не мушу
Забыць вас, добрых аж наўздзіў.

Такое шчырасці, спагады
Больш я не зведала ў жыцці,
Бо праз папрокі і напады
Часцей мне выпала прайсці.

Умілна хвалямі каціла,
Казінка-рэчка ўдаль цякла.
Купацца летам я хадзіла,
Вянкі з лілеяў там пляла.

А ў лесе ягад самых розных:
Чарніц, брусніц, паземак там!
Балота журавін чырвоных
Давала ўволю ўвосень нам.

Хадзіла я з бабуляй Маняй
У лес збіраць баравікі.
Сушылі ў печы іх – духмяны
Мне водар помніцца такі.

Узімку з вечара збярэцца
У хаце нашае сяло.
Гарыць газоўка, ціха льецца
Бяседа – так заўжды было.

Сядзяць, гамонячы аб нечым,
Суседзі нашыя ў нас,
А я ляжу на цёплай печы –
Які ж быў цудоўны час!

Тут хто пра што распавядае –
Здзіўленне, недавер і смех.
Пад гоман гэты засынаю,
Час запавольвае свой бег.

Ноч, як імгненне, пралятае
І ранак свеціць у акно.
Бабуля весела гукае:
– Пара ўжо снедаці даўно! –

У хаце смачненькім так тахне:
Мачанка, дранік, квас яшчэ.
Любімы свой ласунак бачу –
Бабуля сырнікі пячэ.

Ах, страў дзяцінства мілы водар!
Яго я ў сэрцы берагу.
Не ведаў гэткіх смакаў горад,
Так згатаваць я не магу.

Вясной аралі агароды,
Садзілі бульбу талакой.
Праўлялі ўпашкі – з той нагоды
Пілі малінавы напой.

Стол гаспадыні рыхтавалі
Пад яблыняю на двары.
Частункі шчодра выстаўлялі,
Каму што хочацца – бяры.

Каўбаскі хатняй наразалі,
Да ўпашак знятае з шастка.
Яе зімою пальцам пхалі,
Калі калолі парсюка.

Кумпяк салёны адмыслова,
Капуста з дзежкі – смаката!
Гучалі пажаданняў словы,
Каб добра бульбачка расла.

І я, як хвост, каля дарослых
Была з прысмакам у руцэ.
Пасля размоў, гісторый розных
Хтосць запяваў у талацэ.

Усе падхоплівалі песню,
Яна мацнела і плыла
Над полем, возерам і лесам,
Такой шчымліваю была!

Спявалі добрыя суседзі
Так пранікнёна, ад душы
І цеплынёй ад той бяседы
Мне грэцца столькі, колькі жыць.

Упашкі зроблены – Казінка
Усіх рыбай вабіла заўжды.
З сачкамі к рэчцы йшлі жанчынкі,
Мужчыны бралі невады.

Ўклейку, плотачак лавілі –
Любілі рыбу ў нас лавіць.
У печы дробную сушылі,
Каб смачнай поліўкі зварыць.

Рыбачылі і на Умілне –
Усё ж возера, а не рака.
Здзівіў татуля ўловам дзіўным –
Злавіў пад пуд ён шчупака.

А на жывёл не палявалі,
Хаця іх шмат было ў лясах.
Напэўна, проста шкадавалі,
Мяркую я, што гэта так.

Без спраў ніколі не сядзелі
Па аднаму і грамадой.
Затое хлеб, да хлеба мелі
Заўсёды ў вёсачцы маёй.

Але ж у дзень у той вярнуся,
Што мусіла я прыгадаць…
…Жытнёвай сцежкаю імчуся,
Як звонка конікі трашчаць!

Мне ветрык коскі развявае,
Лагодна сонца лашчыць твар,
І я шчаслівая такая,
І столькі радасці і мар!

У сукеначцы, пашытай мамай –
Чырвонай, у беленькі гарох
Бягу, узмахваю рукамі
І рвецца сцежачка з-пад ног.

Узняцца хочацца ў паветра
Над залатою збажынай
І там лунаць з ласкавым ветрам,
Які не прэч гуляць са мной.

Такая лёгкасць ва ўсім целе,
Так лёгка, добра на душы.
Больш не змагла ў жыцці нідзе я
Такіх пачуццяў перажыць.

Усё ў жыцці было, ды толькі
Больш не было такога дня.
Такой шчаслівaю і вольнай
Сябе больш не адчула я.

Не будзе ўжо, як ні маркотна,
У жыцці такого пачуцця,
Каб бестурботна, бесклапотна
Піць радасць светлую жыцця.

Даўно няма ўжо маёй вёскі,
Жыццё ж – імклівае яно.
Ні хат, ні клёнаў, ні бярозкі
І толькі ў сэрцы Казіно.

У жыцці дзе больш, дзе менш благога –
Так тчэцца дзён маіх сувой,
А дзень дзяцінства залатога
Навечна ў памяці маёй.

*верасень 2023г.*

# ЗМЕСТ


*** Выйду раніцай з хаты ………………………….... 7

Памяці знесенай вёскі ……………………………... 8

Вёсачка мая ……………………………………… 10

Прыварожана ……………………………….…..... 11

Тату і маме ………………………………………. 13

На лузе …………………………………………… 14

Ад хваль Альзяніцы…………………………….... 15

Крыніца ……………………………………….….. 16

Памяці майго дзядулі Аўласенка Івана Андрэевіча і ўсіх тых, хто аддаў жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы …………………….….. 17

*** Сціплая добрая бабка Прасення………………… 19

Родная хата …………………………………… 22

Бацькаў калодзеж ………………………….…….. 24

Мой самы светлы успамін …………………….…. 26

**Барадзёнак, Т. Д.**

**Роднай весачкі цяпло :** вершы, паэма / Т. Д. Барадзёнак; рэдактар і камп'ютарны дызайн К. П. Коршун. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2023. – 36 с. : карта, партр., фот., іл.

